**15 красавіка 1954 год. Адкрыт новы цэх.** З кожным годам пашыраецца наша арцель. У бягучым месяцы адкрыт новы калёсны цэх на Кляпінскім лесазаводзе. Ён будзе выпускаць калёсы, абады, дугі. Першая прадукцыя будзе выраблена да 1 мая.

Выканаўшы план першага квартала на 107 працэнтаў, члены арцелі ўзялі абавязацельства да першамайскіх свят выканаць красавіцкае заданне на 130 працэнтаў.

**Мігаль, С. Адкрыт новы цэх / С. Мігаль // Авангард. – 1954. - 15 красавіка. – С. 1.**

**16 красавіка 1964 год. Гурток юных фотааматараў.** У Каменскай васьмігадовай школе працуе гурток фотааматараў. Кіруе ім старэйшы настаўнік Расціслаў Хількевіч. Рабяты ўжо вывучылі будову фотаапарата і ўмела карыстаюцца ім.

**Гаўрыленка, К. Гурток юных фотааматараў / К. Гаўрыленка // Камунар. – 1964. - 16 красавіка. – С.3.**

**5 красавіка 1969 год. Занесены імёны лепшых.** Шмат сумленных людзей працуе ў гаспадарцы саўгас “Кармянскі” на розных участках саўгаснай вытворчасці. І кожны з іх паказвае прыклад, добрасумленна адносіцца да сваіх абавязкаў. Імёны лепшых людзей занесены ў саўгасную Кнігу Народнай Славы.

Сярод тых, хто мацуе родную гаспадарку самаадданай працай, - камбайнёр Мікалай Караткевіч, трактарыст Іван Караткевіч, старшыня групы народнага кантролю другой паляводчай брыгады Іван Іванавіч Мажэйка, свінар Аляксандр Рыгоравіч Шугаёв і многія іншыя. Толькі ў мінулым годзе ў Кнігу Народнай Славы занесены імёны 10 чалавек.

Кожны год добрых вынікаў у працы дабіваюцца нашы механізатары Мікалай Мікітавіч Турлакоў і Канстанцін Якаўлевіч Шугаёў. Іх імёны занесены ў саўгасную Кнігу Пашаны.

**Прахарэнка, Д. Занесены імёны лепшых / Д. Прахарэнка // Зара над Сожам. – 1969. - 5 красавіка. – С.3.**

**10 красавіка 1969 год. Яны пякуць хлеб.** Іншы раз, калі мы заходзім у магазін, дзе прадаецца хлеб, забываем успомніць тых людзей, хто выпякае духмяныя боханы, хто робіць усё, каб хлеб наш быў смачным.

У Струмені ёсць пякарня. Майстрам працуе Піліп Уладзіміравіч Хадановіч. Вялікі стаж у гэтага чалавека, вялікае майстэрства. А набыў Піліп Уладзіміравіч яго тады, калі працаваў у пякарні ў райцэнтры. Выдатна спраўляюцца са сваімі абавязкамі Ганна Малчанава, Наталля Агеева, Лідзія Хадановіч, Ефрасіння Пятрова.

Асобна хочацца адзначыць работу прыбіральшчыцы Надзежды Кроцікавай. 11 гадоў яна працуе ў пякарні, стараецца, каб была ўсюды

чысціня і парадак. І гэтага дасягае. Нездарма на Дошку гонару сельскага спажывецкага таварыства занесена яе прозвішча.

Стаўшы на ленінскую ўдарную вахту, калектыў штодзённа перавыконвае даведзеныя планы. За змену пякарня выпускае 1 тону 100 кілаграмаў гатовай прадукцыі, якая затым паступае ў населеныя пункты, што размешчаны за Сожам. Нядрэнна папрацаваў калектыў у першым квартале бягучага года. План выканан на 101 працэнт.

**Дзенісенка, Ф. Яны пякуць хлеб / Ф. Дзенісенка // Зара над Сожам. – 1969. - 10 красавіка. – С.4.**

**20 красавіка 1974 год. Ад выбараў да выбараў.** Савецкая дзяржава вялікія сродкі выдзяляе на будаўніцтва ў нашай краіне. З кожным годам расце і добраўпарадкоўваецца і наш гарадскі пасёлак Карма. Узводзяцца новыя жылыя дамы, адміністрацыйныя будынкі.

З часу мінулых выбараў у Вярхоўны Савет СССР у г.п. Карма ўведзены ў строй Дом Саветаў, пяць шматпавярховых жылых дамоў, хлебакамбінат, універмаг, гасцініца, кафэ-рэстаран і многія іншыя пабудовы. У бягучым годдзе будаўнікі перасоўнай механізаванай калоны №50 здадуць у эксплуатацыю 32-кватэрны жылы дом, школу на 960 месц, раёны вузел сувязі.

**Стасянкоў, У. Ад выбараў да выбараў / У. Стасянкоў // Зара над Сожам. – 1974. - 20 красавіка. – С.4.**

**12 красавіка 1979 год. Наваселле.** У вёсцы Аляксандраўка здадзены ў эксплуатацыю пяцікватэрны жылы дом. Атрымалі ключы ад кватэр загадчык майстэрні Віктар Данілавіч Белавусаў і даглядчык буйной рагатай жывёлы Сяргей Іванавіч Семяненка. Астатнія кватэры будуць размеркаваны паміж маладымі спецыялістамі, якія прыедуць на працу ў калгас.

У гаспадарцы ажыццяўляецца шырокая праграма жыллёвага будаўніцтва. У гэтым годзе плануецца пабудаваць яшчэ дзесяць жылых дамоў.

**Ерафеенка, М. Наваселле / М. Ерафеенка // Зара над Сожам. – 1979. - 12 красавіка. – С.2.**

**Агляд падрыхтавала бібліятэкар-краязнаўца цэнтральнай раённай бібліятэкі Агеенка Ю.В.**